постели герцогини. А рядом – песочные часы, сухие деревья, оружие и другие символы, которые подтверждают общий назидательный смысл.

Таким образом, канотация символов смерти в изобразительном искусстве Северного Возрождения способствует пониманию авторского дискурса отдельного художника, а также основных мировоззренческих доминант целой эпохи.

*Пациенко А.С.*

## УНУТРАНАЯ ПРАСТОРА БЕЛАРУСКІХ ЗАМКАЎ ЯК АСЯРОДДЗЕ СВЕЦКА-АРЫСТАКРАТЫЧНАЙ СУБКУЛЬТУРЫ

Адчуванне «сваёй» жыллёвай прасторы прыйшло да нашых далёкіх продкаў у першых пячорах і намётах. Галоўным, што давала больш-менш абсталяваная ці проста прыстасаваная пад жыллё прастора, была гарантыя бяспекі і пачуццё абароненасці. З гэтага вынікала пэўная незалежнасць чалавека ад сілаў прыроды, якія на ранніх этапах існавання людскога роду з'яўляліся носьбітамі звышнатуральнай сутнасці. Арганізаванае жыллё, такім чынам, узвысіла чалавека да таго ўзроўню, на якім ён не толькі перастаў быць марыянеткай, але сам змог процістаяць абсалютнай дасканаласці ў асобе ўсемагутнай прыроды.

Па меры таго як чалавек, адчуўшы сябе абароненым дахам і сценамі, паступова перастаў залежаць ад умоў надвор'я ў жыллёвым сэнсе, ён звярнуў увагу на знешні выгляд жылля. Абсталяванне жыллёвай прасторы залежала ад мноства featured разнастайных фактараў, такіх, напрыклад, як род заняткаў гаспадара, яго сацыяльны статус, культурныя арыентацыі, нацыянальныя традыцыі, уласны густ, матэрыяльныя здольнасці і да т.п. Важную ролю адыгрываў і той факт, што чалавек – істота сацыяльная, таму яго інтарэсы і схільнасці пастаянна карэкціраваліся соцыумам. У выніку гэтага жыллё зрабілася выразным адлюстраваннем практычна ўсіх сфер чалавечага быцця.

Калі разглядаць культуру прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя ў Вялікім княстве Літоўскім, дык, на нашу думку, яе існаванне непасрэдна звязана з замкавай прасторай. Менавіта княжацкія і магнацкія ўладанні з'яўляліся цэнтрамі свецка-арыстакратычнай субкультуры.

У канцы XIII—XIV ст. праяўленні свецкай субкультуры ў Вялікім княстве Літоўскім насілі даволі стрыманы характар. Можна сцвярджаць, што адзінымі месцамі праяўлення свецкай культуры ў Вялікім

княстве Літоўскім у гэты час былі замкі вялікіх князёў. Прычым нават тут прадстаўнічая, рэпрэзентатыўная функцыя выконвала другасную ролю, падпарадкаваўшыся задачам абароны. Гэта адлюстроўвалася як у складзе насельніцтва, асноўную частку якога складалі вайскоўцы, так і ў характары матэрыяльнай культуры і побыту.

З'явамі свецкага характару ў культуры прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя Вялікага княства Літоўскага ў канцы XIII—XIV ст. былі афіцыйныя цырымоніі каранацый, прысяг, вяселляў, пахаванняў вялікіх князёў. Агульнадзяржаўнымі святамі лічыліся дні нараджэння і імянін самаго гаспадара, а таксама з'яўлення наследніка ў сям'і вялікага князя і г.д. Што датычылася неафіцыйнай часткі жыцця беларускіх арыстакратаў, дык адной з найбольш папулярных формаў правядзення вольнага часу было паляванне. Яно магло выступаць як састаўная частка рознага кшталту ўрачыстых святкаванняў, так і як самастойная забава. Без доўгадзённых ловаў не абыходзілася ні адна ўрачыстасць, што адзначалася ў княжацкіх дварах.

Імкненне паляваць з раскошай было вельмі характэрна для прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя беларускага грамадства. Праяўлялася гэта, напрыклад у тым, што пад паляўнічыя домікі яны адводзілі цэлыя замкі. Паляўнічай рэзідэнцыяй літоўскіх князёў быў Крэўскі замак. Калі ў 1345 г. Альгерд атрымаў вялікакняжацкі трон, ён пераехаў у Вільню. Былы ж княжацкі замак у Крэве «...доўгі час служыў зборным паляўнічым пунктам, а яго муры агучваліся вясёлымі воклічамі гуляючых удзельнікаў банкетаў» [5, 775].

У канцы XV ст. з пашырэннем будаўніцтва прыватнаўласніцкіх замкаў іх уладары скіравалі сваю ўвагу на арганізацыю і добраўпарадкаванне спецыяльных месцаў для палявання. Магнаты імнуліся мець у сваіх уладаннях звярынцы – абсталяваныя асаблівым чынам лясныя ўгоддзі, прыстасаваныя для аблаў і загону дзікай жывёлы. Для звярынца выбіралася месца непадалёку ад магнацкай рэзідэнцыі. Напрыклад, радзівілаўскі звярынец знаходзіўся ў паўднёвым прыгарадзе Нясвіжа. За тры кіламетры ад Міра таксама было месца, прызначанае для панскага палявання.

Адзначым, што рэзідэнцыі станавіліся месцам усіх больш-менш значных падзей у жыцці арыстакрата. Тут ён нараджаўся, атрымліваў першую адукацыю, святкаваў веселле, тут гадаваліся яго дзеці, адсюль ён сыходзіў на вечны пакой. Жыллё прадстаўніка вышэйшага саслоўя дэманстравала не толькі яго фінансавыя магчымасці, але і ўзровень культуры, густ, прыхільнасці і г.д. Часам сама архітэктура княжацкіх і магнацкіх замкаў сведчыла аб тых ці іншых падзеях з жыцця іх гаспа-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дароў. Напрыклад, даследчык В.В.Калнін дапускае, што архітэктурнае вырашэнне Мірскага замка магло сфарміравацца пад уплывам малдоўскай архітэктуры. Верагоднай падставай для гэтага быў малдоўскі паход войска Вялікага княства Літоўскага супраць туркаў напрыканцы XV ст., у якім прымаў удзел гаспадар будучага замка Юрый Ілініч. Магчыма, спадабаўшыся Ілінічу, выгляд тамтэйшых замкаў пэўным чынам паўплываў на дэкаратыўнае вырашэнне Мірскай рэзідэнцыі. Італьянскі ўхіл архітэктуры Нясвіжскага замка стаў бясспрэчным праяўленнем замежных вандровак Мікалая Радзівіла Сіроткі.

На нашу думку, пік праяўлення індывідуальнасці ў замкавай архітэктуры прыпаў на канец XVI—XVII ст. Любыя з'явы ў самых розных галінах чалавечай дзейнасці, якія цікавілі магната, знаходзілі сваё ўвасабленне ў яго рэзідэнцыі. Прыватнаўласніцкі замак з прылеглымі да яго тэрыторыямі быў падпарадкаваны адзінай задачы – задавальняць любым інтарэсам уладара. Архітэктура пабудовы, яе знешні і ўнутраны дэкор, планіроўка і прызначэнне прасторы павінны былі цалкам адпавядаць густам гаспадара. Прыватнаўласніцкія замкі зрабіліся ўвасабленнем індывідуальнасці арыстакрата. Гэта былі адзінкавыя пабудовы, за кожнай з якіх стаяла канкрэтная гістарычная асоба.

У больш раннія перыяды (канец XIII – XIV стст.) агульнадзяржаўныя замкі прадстаўлялі сабой даволі тыповыя пабудовы. У аснове іх архітэктурнага вырашэння ляжаў той ці іншы тып. Напрыклад, Лідскі, Крэўскі, Медніцкі замкі належалі да тыпу «кастэль». Навагрудскі і Гродзенскі Стары замкі мелі шмат агульных характарыстык, уласцівых для групы замкаў, якія размяшчаліся на ўзвышшах.

Пачынаючы з XVI ст. архітэктурнае вырашэнне прыватнаўласніцкіх замкаў становіцца значна разнастайней. Дастаткова прыгадаць абрысы Мірскага, Гераненскага (пачатак XVI ст.), Нясвіжскага (канец XVI ст.) ці Гальшанскага (першая палова XVII ст.) замкаў, каб адчуць усё багацце і непадобнасць архітэктурных форм прыватнаўласніцкага будаўніцтва. Магнаты сустракалі прататыпы для сваіх рэзідэнцый не толькі і не столькі ў Вялікім княстве Літоўскім, колькі ў архітэктуры Італіі (Нясвіж), Галандыі (Гальшаны) і іншых еўрапейскіх краін. Таму можна сцвярджаць, што архітэктура рэзідэнцый адлюстроўвала не толькі агульнамастацкія тэндэнцыі, але і ўласныя прыхільнасці магнатаў.

Модныя тэндэнцыі XVII – пачатку XVIII стст. пэўным чынам уніфікавалі магнацкія ўладанні, яшчэ больш узбагаціўшы мясцовы уклад здабыткамі заходнееўрапейскай цывілізацыі і культуры. Напрык-

лад, у кожнай буйной магнацкай рэзідэнцыі абавязкова мелася бібліятэка. Як правіла, бібліятэкі размяшчаліся ў замках у асобных даволі вялікіх зальных памяшканнях. Памеры і бібліяграфічная вартасць збору залежалі ад багацця і старажытнасці роду яго ўладароў. Так, бібліятэка Радзівілаў была заснавана ў XVI ст. У 1772 г. яна налічвала больш за 20 тысяч тамоў на розных мовах. Гэта былі творы антычных аўтараў, французскіх асветнікаў, гістарычныя і юрыдычныя выданні, а таксама інкунабулы, рукапісы, старадрукі. Тут былі кнігі, выдадзеныя як у друкарнях розных краін Еўропы, так і ў асабістых друкарнях Радзівілаў. Вялікая бібліятэка з архівам належала роду Сапегаў.

Акрамя кніжных калекцый у замках захоўваліся багатыя архівы і музейныя зборы. Магнацкія архівы ўтрымлівалі разнастайныя гістарычныя дакументы. Сярод старажытных актаў былі прывілеі на пасады і падараванне маёнткаў, дакументы гаспадарчага і адміністратыўнага кіравання, паперы, якія ўтрымлівалі генеалагічную інфармацыю, перапіска высокапастаўленых асоб, інвентары, граматы, фінансавыя дакументы і г.д. Самым вялікім архівам, які захоўваўся ў прыватнаўласніцкім замку, быў Нясвіжскі архіў «Літоўскай метрыкі». Што датычыцца музеяў у магнацкіх рэзідэнцыях, дык іх «фонды» папаўняліся рознымі шляхамі: некаторыя экспанаты магнаты прывозілі з замежных вандровак, іншыя – атрымлівалі ў спадчыну ад прадстаўнікоў роду ці ў якасці падарункаў ад высокіх гасцей, а часам і проста самі набывалі за грошы. Сярод музейных экспанатаў сустракаліся рэшткі прадстаўнікоў дагістарычнай і экзатычнай фауны, рыцарскія даспехі, гетманскія булавы, паляўнічыя трафеі і інш. Тое, што такое калекцыяніраванне адбывалася на працягу некалькіх стагоддзяў, ператварала зборы рэдкасцяў і featuring рознага кшталту рарытэтаў у сапраўдныя музеі старажытнай культуры.

Калекцыяніраванне было вельмі распаўсюджаным заняткам сярод прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя. Магнаты збіралі карціны, творы мастацтва як мясцовых, так і замежных майстроў, зброю, нумізматычныя калекцыі. Прэстыжным у арыстакратычным асяроддзі лічылася мець у замку партрэтныя галерэі продкаў. Вялікай колькасцю жывапісных палотнаў адрозніваўся Нясвіжскі замак Радзівілаў. Так, Каралеўскую залу ўпрыгожвалі партрэты польскіх каралёў, Гетманскую – партрэты польскіх і літоўскіх гетманаў, у ліку якіх былі і продкі знакамітага роду. Захаваліся звесткі пра тое, што ў XVIII ст. у Нясвіжы мелася нават багатая калекцыя партрэтаў пэндзля Рэмбранта [2, 378].

Магнаты-аматары тэатральнага і музычнага майстэрства ці проста прыхільнікі ўсяго новага імкнуліся ствараць у сваіх уладаннях тэатры і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музычныя капэлы. Прычым нярэдка самі арыстакраты ці члены іх сем'яў з задавальненнем займаліся музыкай ці прымалі ўдзел у тэатральных пастаноўках. Напрыклад, вялікімі прыхільнікамі музычнага майстэрства былі Марцін Мікалай і Галена Радзівілы, Міхал Казімір Агінскі, Ганна Патоцкая, роджаная Тышкевіч, Соф'я Замойская, роджаная Чартарыская, шматлікія іншыя прадстаўнікі знатнейшых магнацкіх радоў.

З вялікай прыхільнасцю да тэатральнага мастацтва ставілася славутая аўтарка шматлікіх п'ес княгіня Уршуля Францішка Радзівіл. У сярэдзіне XVIII ст. на нясвіжскай сцэне рэгулярна дэманстраваліся яе драматычныя пастаноўкі, у якіх нярэдка прымалі ўдзел сваякі і знаёмыя Радзівілаў. У дыярыюшы мужа княгіні Уршулі Міхала Казіміра сустракаюцца наступныя запісы. 13 чэрвеня 1746 г.: «...па абедзе з усёю кампаніяй езьдзіў да Альбы, там кампазыцыі жонкі маёй, пад небам, вельмі пекная адправілася камедыя празь дзяцей маіх, паннаў і дворскіх, знаных усё людзей...» [1, 188]. 11 снежня 1746 г.: «Па абедзе быў на залі, там дочкі мае камедыю гралі, Кацярына надта добра спрэзэнтавала сваю пэрсону» [1, 194].

Асабліва прэстыжным заняткам сярод прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя беларускага грамадства лічылася конегадоўля. Не кожны магнат мог дазволіць сабе займацца гэтай справай. Любоў да коней патрабавала вельмі вялікіх сродкаў, бо кошт добрага каня быў надзвычай высокі, не кажучы ўжо аб выдатках на яго ўтрыманне. Конегадоўля ў большай ступені была справай арыстакратычнага гонару і прэстыжу. Валоданне цэлымі стайнямі з пародзістымі коньмі сведчыла аб каралеўскім багацці. Лідэрамі і ў гэтай галіне былі нетытулаваныя каралі Вялікага княства Літоўскага – Радзівілы. Іх стайня проста здзіўляла багаццем і раскошай. З XVII ст. у конным двары Нясвіжскага замка існавала спецыяльнае падземнае памяшканне для коней. Яно мела выгляд доўгай высокай галерэі з калонамі, распісанымі пад чырвонае дрэва. Там размяшчалася да 50 чыстакроўных коней, якія адносіліся да польскай, венгерскай і рускай стайняў. Пасярод «залы» ляжаў пышны дыван, паўсюды было шмат люстэрак. Памяшканне адрознівалася выключнай чысцінёй і пахам накураных духмянасцяў.

Такім чынам, асноўным і практычна адзіным месцам праяўлення свецка-арыстакратычнай субкультуры ў Вялікім княстве Літоўскім былі замкі. Менавіта гэтыя пабудовы з'яўляліся жыллём яе носьбітаў. Замкі, як агульнадзяржаўныя, так і прыватнаўласніцкія, дэманстравалі асноўную ідэю арыстакратычнай культуры – яе рэпрэзентатыўнасць. Адзначым, што гэтая функцыя выконвалася і ў замках канца XIII – XIV



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стст. Аднак там яна праяўлялася яшчэ не дастаткова выразна. Інтэр'еры ранніх замкаў, якія знаходзіліся на дзяржаўным утрыманні, адрозніваліся сціпласцю. Раскоша і багатае ўбранства былі ўласцівы толькі княжацкім пакоям. Рэпрэзентатыўная функцыя адлюстроўвалася не столькі ў знешнім выглядзе пабудоў, колькі ў замкавых інтэр'ерах. Нягледзячы на аскетычны выгляд суровых каменных воінаў, беларускія замкі з самага пачатку былі прадстаўнічымі, свецкімі пабудовамі. Іх прастора прызначалася не толькі для размяшчэння вайсковых гарнізонаў, але і для жылля прадстаўнікоў арыстакратыі. Акрамя пастаянных жыхароў знатнага паходжання, частымі наведвальнікамі замкаў былі шматлікія высокапастаўленыя госці. Сюды прыязджалі паслы замежных краін з дыпламатычнымі місіямі альбо па запрашэннях на разнастайныя ўрачыстыя цырымоніі. У замках заключаліся уніі і перамір'і, складаліся дзяржаўныя дакументы.

Найбольшага росквіту свецка-арыстакратычная субкультура дасягнула ў прыватнаўласніцкіх замках. Магнаты, не шкадуючы сродкаў, выдаткоўвалі на прадстаўнічасць свайго жылля вялізныя грошы. Замкі некаторых з іх па багацці і раскошы не саступалі каралеўскім палацам. Аднак варта ўсвядоміць не толькі вялікую матэрыяльную, але і духоўную каштоўнасць гэтых пабудоў. Прыватнаўласніцкія замкі канца XVI – XVIII стст. ужо не столькі вырашалі задачы элементарнага выжывання падчас вайсковых дзеянняў, колькі выражалі мастацкія густы, з'яўляліся адлюстраваннем культурнага ўзроўню сваіх уладальнікаў. Асаблівая значнасць замкаў заключаецца ў тым, што яны задавальнялі не толькі матэрыяльныя, але і духоўныя патрэбы сваіх гаспадароў. Бібліятэкі, музеі, тэатры, паркі ператварылі жыллё арыстакратаў у буйныя цэнтры мастацтва і культуры. І кожная праява гэтай культуры спявала гімн гаспадару – творцы гэтых зямных цудаў.

ЛІТАРАТУРА:

1. Дыярыюш князя Міхала Казіміра Радзівіла, ваяводы Віленскага Гетмана Вялікага В.К.Літ. // Спадчына. – 1995. – № 6. – С. 170—199.

2. Мальдзіс А. Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі. – Мінск: Лімарыўс, 2001. – 384 с.

3. Ткачоў М.А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII – XVIII стст. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – 140 с.

4. Kotiubaj. E. Galerja Nieьwieцska portretyw Radziwiiiowskich. – Wilno, 1857. – 557 s.

5. Zahorski W. Zamek w Krewie. – "Ziemia", t.3. Warszawa, 1912.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ